А.Я.Карацееў
/Кафедра духавой музыкі/

# ПРАЦЭС ФАРМІРАВАННЯ ГЕРОІКА-ПАТРЫЯТЫЧНАГА РЭПЕРТУАРУ АРКЕСТРАЎ ДУХАВЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ І АНАЛІЗ ЯГО СТАНУ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ РАЗВІЦЦЯ МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

Даследаванне творчай дзейнасці прафесійных /грамадзянскіх і ваенных/, аматарскіх і вучэбных аркестраў духавых інструментаў /дзіцячыя і дарослыя саставы/ дазволіла вызначыць, што гераіка-патрыятычны характар музычных твораў у рэпертуары гэтых калектываў займае даволі значнае месца.

Творы гэтага тэматычнага накірунку ў аркестравым выкладанні, а таксама прызначаныя для салістаў-вакалістаў пад акампанемент духавых саставаў, паспяхова гучаць перад прадстаўнічай аудыторыяй слухачоў як у канцэртных залах, так, асабліва, і ў час абслугоўвання сацыяльна-значных, культурна-масавых і спартыўных мерапрыемстваў, масавых тэатралізаваных прадстаўленняў на адкрытым паветры. Гэта дазваляе адначасова вырашаць шырокія выхаваўчыя задачы як у гераіка-патрыятычным, так і ў эстэтычным накірунках, а таксама садзейнічае актыўнай папулярызацыі творчай дзейнасці духавых аркестравых саставаў, пашырае аудыторыю слухачоў у плане яе ўзроставага прадстаўніцтва.

Трэба заўважыць, што нягледзячы на ярка-эмацыянальнае уздзеянне, пераканаўчыя тэмбрава-каларыстычныя, аб"ёмна-насычаныя і кантрасна-дынамічныя асаблівасці, духавая музыка усё ж не стала аб"ектам старанных даследаванняў розных спецыялістаў: філосафаў /пытанні эстэтыкі/, псіхолагаў, педагогаў і нават музыказнаўцаў. Звернемся, напрыклад, да тых пазіцый некаторых вучоных, якія вызначылі ў галіне эстэтыкі, псіхалогіі мастацтва свой пункт гледжання па пытаннях мастацтва. Справядлівыя выказванні Л.Петражыцкага пра спецыялістаў у галіне эстэтыкі, якія памылкова мяркуюць, што мастацтва мае сваёй мэтай толькі узбуджаць, абуджаць эстэтычныя пачуцці. На яго думку, мастацтва усё ж выклікае цэлы шэраг а г у л ь н ы х эмоцый, а эстэтычныя эмоцыі ў гэтым патоку адыгрываюць толькі дэкаратыўную ролю. На наш погляд, далейшы працяг тэарэтычных распрацовак у гэтым ракурсе адносна духавой музыкі ў плане эстэтычнага ўспрыняцця, выклікаў

бы заслужаную цікавасць, бо яна валодае даволі шырокім спектрам уздзеяння на чалавека. Пазначаная праблема была б вывучана больш грунтоўна, калі б падобныя распрацоўкі уключалі параўнальны аналіз у адносінах да іншых відаў мастацтваў. Але ў гэтым выпадку патрэбен гранічна ўзважаны, аргументаваны падыход, каб з шырокай панарамы ўсіх відаў мастацтваў разабрацца і вычленіць іх асаблівасці. На наш погляд, каб такія ацэнкі былі непрадузятымі, асобаснае ўспрыняцце, індывідуальныя ўражанні, эстэтычную рэакцыю на розныя віды музыкі /фальклор, духавая, эстрадная, сімфанічная музыка/, нельга ўзводзіць у абсалют і з такой пазіцыі рабіць здагадкі, разважанні аб іх перавазе па банальнаму прынцыпу: "гэта мне падабаецца, а гэта не падабаецца". Папярэджваючы аб заганнасці такога падыходу, А.Яўлахаў, напрыклад, адзначаў, што, у такім выпадку, "самым "настоящим", самым "истинным" искусством нужно признать военную и бальную музыку, так как та и другая заражают еще более"[1]. Бясспрэчнасць поглядаў, на нашу думку, заключалася б -- выяўленні ўсіх мастацкіх асаблівасцей і своеасаблівасці канкрэтнага віду музыкі, канкрэтнага віду мастацтваў, вызначэнні іх месца ў структуры мастацкай культуры. Таму разважанні, безумоўна, павінны весціся аб спецыфічных асаблівасцях у с п р ы н я ц ц я і ў з д з е я н н я таго ці іншага віду мастацтва сукупнасці яго мастацка-выразных сродкаў. І, калі ўжо мы вядзем размову аб музычным мастацтве ў прыватнасці, то неабходна арыентавацца па ўсіх яго разнавіднасцях, жанравай разнастайнасці, выяўляць найбольш характэрныя, значна індывідуальныя і непаўторныя іх перавагі, але абавязкова з пункту гледжання максімальнай сацыямастацкай каштоўнасці, гэта значыць грунтуючыся на аб"ектыўных заканамернасцях развіцця і высокіх крытэрыях значнасці мастацкай культуры ў жыцці грамадства. У сваім даследаванні мы і паспрабавалі часткова гэта зрабіць, разглядаючы толькі адзін аспект гэтай шматграннай праблемы -- асаблівасць працэсу фарміравання твораў менавіта героіка-патрыятычнага накірунку ў творчай дзейнасці духавых аркестраў, улічваючы яе ўстойлівае месца ў рэпертуары гэтых шырока распаўсюджаных калектываў і як адзін з фактараў іх папулярнасці.

---

1 Евлахов А.М. Введение в философию художественного творчества: Опыт историко-литературной методологии. -- Варшава, 1910, т. I.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Не памяншаючы значнасці духавой музыкі, асабліва яе героіка-патрыятычнага накірунку, існуюць усё ж розныя пункту гледжання на гэтым пытанні. Некаторыя даследчыкі салідарныя з думкай Л.Петражыцкага, які лічыць, што "искусство воинственного периода народной жизни бывает приспособленно главным образом к возбуждению героическо-воинственных эмоциональных волнений и настроений... военная музыка существует вовсе не для того, чтобы доставлять солдатам на войне эстетические удовольствия, а для того, чтобы возбуждать и потенцировать воинственные эмоции"[2]. Л.Выгодскі ж, наадварот, сцвярджае, што ваенная музыка на вайне ніякіх ваяунічых эмоцый не выклікае[3] і падкрэслівае пры гэтым, спасылаючыся на Д.Аусяніка-Кулікоускага[4], што ён "гораздо более прав, когда полагает, что военная лирика и музыка "подымают дух" войска , "воодушевляют" на подвиг, но ведь они не разрешаются боевой эмоцией или боевым аффектом. Они скорее умеряют и дисциплинируют боевой пыл, а кроме того, успокаивают взвинченную нервную систему и прогоняют страх"[5], тым самым нібы адкрываюць свабодны шлях для храбрасці.

Выкарыстоуваючы рэтраспектыуны метад даследавання, сістэмна-структурны аналіз сучаснага развіцця жанру духавой музыкі, мы паспрабавалі прааналізаваць, якім жа чынам ажыццяулялася фарміраванне героіка-патрыятычнай тэматыкі у рэпертуары аркестрау духавых інструментау, якія асаблівасці гэтага працэсу?

Зыходным пунктам разгляду гэтага пытання з"явілася дзейнасць ваенных інструментальных саставау. Яшчэ калі беларускія землі уваходзілі у састау Старажытнай Русі, у жыцці баявых дружын ваенная музыка займала важнае месца. Трубы, дудкі, жалейкі, рагі, бубны і іншыя народныя духавыя і ударныя інструменты да-

2 Петражицкий Л.И. Введение в изучение права и нравственности. Основы эмоциональной психологии. -- Спб., 1907. -- С. 293.

3 Выгодский Л.С. Психология искусства. -- М.: Педагогика, 1987. -- С. 231.

4 Овсянико-Куликовский Д.Н. Собр. соч.: В 9 т. -- Спб., 1912--1914. -- 1914, т. 6. -- С. 193.

5 Выгодский Л.С. Психология искусства... -- С. 231.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зваляді старажытным музыкантам выконваць даволі разнастайныя мелоды.

На аснове аналізу летапісных крыніц мы прыйшлі да высновы аб тым, што гэтыя музычныя інструменты ў час бітваў выконвалі не толькі сігнальныя функцыі, але і выкарыстоўваліся для падтрымання баявога духу воінаў. Такім чынам, ужо на першапачатковым этапе стварэння ваенных фарміраванняў э м а ц ы я н а л ь н а-м а б і л і з у ю ч а е уздзеянне духавых саставаў і духавой музыкі ў цэлым, было даволі значным. Тут, безумоўна, можна весці размову толькі аб лаканічных і нескладаных, у плане меладычнага развіцця, музычных пабудовах. А вось ужо практыка музіцыравання інструментальных капэл, янычарскіх аркестраў у войску Вялікага княства Літоўскага ХУП--ХУШ стст. вызначалася строгай дыферэнцыяцыяй па тэматычным накірунку рэпертуару. І ў гэтым плане гераіка-патрыятычная тэматыка займала адно з вядучых месц.

Вывучэнне дакументаў наступных гістарычных перыядаў дае нам не толькі панараму разнажанравага развіцця духавой музыкі, але і дазваляе праілюстраваць гэты працэс ужо канкрэтнымі творамі. Так, у рэпертуары аркестра гомельскай музычнай школы над кіраўніцтвам Т.Сіпайлы /1830--1837 гг./ былі такія творы, як "Марш" Эбе для дзевяці інструментаў, "Марш" Куфнера для шаснаццаці інструментаў, уверцюра "Бой" для дзесяці інструментаў, "Бой пад Мажайскам" для трынаццаці інструментаў і інш.[6] Трэба звярнуць увагу і на рэпертуар Мінскага гарадскога духавога аркестравага саставу XIX стагоддзя. Калі яго ўзначальваў В.Стэфановіч /1837--1862 гг./, калектыў выконваў "Папуры на тэмы шасці маршаў" Крумера, папуры "Шэсць ваенных маршаў" Балердэіры і інш.[7] Новы капельмайстар калектыву -- А.Чартовіч, які ўзначаліў аркестр у 1863--1868 гг., даволі актыўна займаўся пытаннямі пашырэння рэпертуару. У плане нашага даследавання можна адзначыць, што сярод твораў, якія выконваў аркестр, гучалі фрагменты з опер "Фенела" /"Нямая з Порцічы"/ Д.Абера, "Жыццё за цара" Глінкі, "Гугеноты" Дж.Мейербера і інш.[8]

---

6 Цэнтр. дзярж. гіст. арх. Беларусі /Мінск/, ф. 1781, воп. 1, с. 310, л. 7--9.

7 Тамсама, ф. 24, воп. 1, с. 1284, л. 147--148.

8 Тамсама, л. 100--106.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Акрамя цывільных духавых аркестраў у XIX — пачатку XX стагоддзяў у Беларусі шырокае распаўсюджанне атрымалі ваенныя саставы, у рэпертуары якіх гераіка-патрыятычная тэматыка была прадстаўлена даволі шырока[9]. Найбольшае ўражанне ў гэты час рабілі выступленні зводных ваенных духавых аркестраў. Напрыклад, такі калектыў выступаў у снежні 1901 года на дабрачынным вечары Чырвонага Крыжа ў Мінскім гарадскім тэатры: "Игра трех хоров военной музыки под управлением М.Н.Борисова... навеяло на многочисленную публику лучшее так сказать, настроение и аплодисменты исполнителям были вполне искренны и по достоинству"[10]. А ў фінале гэтага канцэрта паспяхова прагучала ўрачыстая гераічная уверцюра "1812 год" Чайкоўскага — твор, які даступны для выканання толькі высокапрафесійным музыкантам і ў плане тэхнічнага майстэрства, і ў плане ансамблевага музіцыравання, прычым на ўзроўні прадстаўнічага зводнага саставу. У рэпертуары ваенных аркестраў у гэты час з'яўляюцца і такія творы, якія атрымалі ўсеагульнае прызнанне і надзвычайную папулярнасць, як вальс "На сопках Маньчжурыі" І.Шатрова, марш "Развітанне славянкі" В.Агапкіна. Гісторыя стварэння, напрыклад, унікальнага па музычнай драматургіі, меладычнай пранікнёнасці і пластыкі дзіўнага па тэматычнаму кантрасту марша "Развітанне славянкі" — ад песенна-лірычнай, замілавана-пяшчотнай пластычна гібкай мелодыі да ўрачыста-узвышанай, акордава-мужнай перадачы, па-майстэрску інструментаваных Н.Багарадам, грунтоўна выкладзена ў манаграфіі У.Сакалова[11].

Мы спецыяльна апускаем даволі значны перыяд у развіцці духавых аркестраў і фарміраванне іх рэпертуару з 1917 па 1940-я гады, бо гэта патрабуе асаблівага аналізу і асаблівых каментарыяў гістарычнага працэсу.

З розных аспектаў працэсу фарміравання гераіка-патрыятычнага рэпертуару духавых аркестраў нас зацікавілі такія актуаль-

---

9 Цэнтр. дзярж. гіст. арх. Беларусі /Мінск/, ф. 466, воп. 1, с. 230, л. 65, 78а, 83 і інш.

10 Вечер "Красного Креста" // Мин.листок.— 1901. — 4 дек.

11 Соколов В. "Прощание славянки": Жизнь и творчество В.И.Агапкина — автора популярного марша. — М.: Сов. композитор, 1987. — С. 50—59.

ныя пытанні, як значэнне героіка-патрыятычных твораў для духавых аркестраў у гады Вялікай Айчыннай вайны і вопыт увасаблення тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў рэпертуары духавых аркестраў.

Нягледзячы на катаклізмы гэтага гістарычнага перыяду, выканальніцкая дзейнасць ваенных духавых аркестраў на франтах была даволі інтэнсіўнай і шматпланавай:

1/ дапамога войскам для арганізаванага руху на маршах -- цяжкіх і знясільваючых;

2/ у перапынках паміж баямі на музыкантаў ускладаўся абавязак стварэння армейскай мастацкай самадзейнасці. Вялікай увагі патрабавала работа з ротнымі запявaламі па развучванню новых страявых песень;

3/ падрыхтоўка і правядзенне канцэртных выступленняў для воінаў.

Аб тым, наколькі былі неабходныя гэтыя канцэрты, сведчаць успаміны беларускіх армейскіх музыкантаў: "Мы давали концерт для воинов, которые после тяжелого и большого марша остановились на отдых, чтобы через несколько часов снова вступить в бой. Глядя на усталые, измученные лица бойцов, поневоле думалось: а нужно ли им сейчас наше выступление? Не лучше ли и нам взять в руки оружие и пойти в бой на врага... Оркестр заиграл вступление... По мере того как патриотические, героические и народные песни сменяли одна другую, мы стали замечать, как на лицах бойцов постепенно исчезают суровость и усталость, глаза становились оживлёнными и светлыми... Закончился концерт, и на какое-то мгновение кругом воцарилась глубокая тишина. Внезапно над всей лесной поляной прогремел шквал аплодисментов, и мы увидели счастливые лица, полные глубокой благодарности"[12].

Канцэртная работа ваенных духавых аркестраў была вельмі насычанай, аб чым можа сведчыць колькасць выступленняў вядучага ваеннага аркестра Наркамата Абароны пад кіраўніцтвам С.Чарнецкага: больш як 500 канцэртаў на франтах, каля 300 канцэртаў на розных пляцоўках, звыш 500 службовых выступленняў[13]. Але ва умо-

---

12 Цит. па кн.: Ренанский А.Л. Эстетическое воспитание учащихся. /Литературно-музыкальные композиции и беседы/. -- Мн.: Нар. асвета, 1978. -- С. 27.

13 М.Казанов. Фанфары в строю // СМ, 1978, № 2. -- С. 24.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вах маскіроўкі на перадавой аркестры не маглі выступаць у поўным саставе, і тады музыканты стваралі так званыя "акопныя групы".

У рэпертуары таго часу гучалі шматлікія пераладжэнні песенных твораў савецкіх кампазітараў: "Свяшчэнная вайна" А.Аляксандрава, "Песня смелых" В.Белага, "Будзе Гітлеру канец" Р.Гліэра, "Мы фашыстаў разаб"ем" В.Мурадэлі, "Дарогі" А.Новікава, "У зямлянцы" і "Тачанка" К.Лістова, "Давай закурым" М.Табачнікава, "Сіняя хустачка" і інш. З усёй разнастайнасці гэтага рэпертуару, які выконваўся духавымі аркестрамі, песня А.Аляксандрава "Свяшчэнная вайна" па-праву з першых дзён вайны набыла статус канцэнтраванага музычнага сімвала, што увасабляў магутны дух савецкага народа, які узняўся на гераічную барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Як указвае музыказнаўца І.Несцьеў, "широкие мелодические контуры, тяжелая ритмическая поступь и суровый ладовый колорит, близкий к минорному строю старых революционных песен, придают этой песне особо запоминающийся, индивидуальный характер"[14]. Падабенства мелодыка-тэматычнай асновы "Свяшчэнная вайны" з рэвалюцыйнымі песнямі, заўважанае музыказнаўцам І.Несцьевым, не выпадковае. Як дазволілі ўстанавіць апошнія даследаванні, гэты твор, як з змененымі некаторымі словамі вершаў, быў напісаны яшчэ ў гады першай сусветнай вайны /пераканаўчая аргументацыя і неабходныя супастаўленні прыводзіліся ў адной з перадач Д.Захарава па першай праграме Расійскага тэлебачання ў пачатку 1993 г./.

У гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі разгарнулася бязлітасная барацьба з ворагам сіламі партызан. Адной з характэрных з"яў гэтага перыяду з"ўляецца стварэнне і актывізацыя дзейнасці, пачынаючы з зімы 1943 г., у розных атрадах, брыгадах, злучэннях на тэрыторыях партызанскіх зон, калектываў мастацкай самадзейнасці: агітбрыгад, мастацкіх ансамблей, ансамблей песні і танца, партызанскіх джаз-аркестраў і інш. Акрамя вырашэння задач па арганізацыі вольнага часу партызан, такія агіткалектывы выступалі і перад жыхарамі акупіраванай тэрыторыі. Формы гэтых выступленняў былі рознымі, часам вельмі вынаходлівымі:

---

14 Нестьев И.В. Массовая песня. -- В кн.: Очерки советского музыкального творчества. М.-Л.: Музгиз, 1947.-- С. 270--271.

канцэрты-мітынгі коннай разведкі, якія праводзіліся не сыходзячы з коней; канцэрты-"вечарынкі" для прыкрыцця партызанскіх сходак у занятых фашыстамі вёсках; інсцэніроўкі разгульнага вяселля для раптоўнага налёту на нямецкія гарнізоны[15].

Музыказнаўца Б.Смольскі адзначае, што "ва ўсіх партызанскіх злучэннях і брыгадах былі свае артысты, спевакі, баяністы, балалаечнікі*, а ў асобных выпадках нават духавыя аркестры"[16]. Так, напрыклад, у адной з баявых аперацый партызаны атрада імя М.В.Фрунзе Мінскай вобласці разграмілі нямецка-паліцэйскі батальён і, разам з іншымі трафеямі, у атрад быў дастаўлены поўны камплект інструментаў для духавога аркестра. Сярод партызан, як адзначае С.Пятровіч, знайшліся ядрэнныя музыканты, якія праз некалькі дзён змаглі выканаць невялікі рэпертуар, пераважна гераіка-патрыятычныя творы /маршы, пералажэнні масавых песень/, а таксама папулярныя танцавальныя мелодыі. Гучаннем бадзёрага марша сустрэлі яны савецкага парашутыста, закінутага з тылу, які, у сваю чаргу вырашыў, што трапіў у размяшчэнне нямецкага гарнізона, бо не мог уявіць, што ва ўмовах партызанскага быту магчыма існаванне такога аркестра[17].

Музыка духавых аркестраў суправаджала партызан пастаянна -- яна рэгулярна гучала ў перадачах Усесаюзнага радыё. Звыш 150 выступленняў па прамой трансляцыі і больш як 30 запісаў на плёнку былі зроблены за гады вайны Першым Асобным паказальным аркестрам Наркамата Абароны СССР пад кіраўніцтвам С.Чарнецкага. Асабліва ўрачыста гучаў аркестр у гонар вызваленых гарадоў. Аб уздзеянні гэтай музыкі прыгадвае былы камандзір асобага партызанскага атрада, які дзейнічаў у Беларусі, М.М.Міхайлюк: "В глубо-

---

15 Мухаринская Л. Песни партизанского края // МЖ, 1977, № 3. -- С. 9.

16 История музыки народов СССР. М.: Сов. композитор, 1972, т. 3. -- С. 342.

* як паведаміў у інтэрв"ю заслужаны работнік культуры УССР, былы камісар і мастацкі кіраўнік ансамбля песні і танца агітатрада імя М.Горкага А.С.Нікалаеў, у калектывах былі кларнетысты, трубачы.

17 Петрович С. Лесные артисты // Клуб и худ. самодеят. 1967, № 11. -- С. 28.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ком тылу противника оркестров не было. Но был у нас в землянке патефон и было радио. И если передавали духовую музыку -- мы знали, что наши войска хорошо бьют врага"[18].

Разглядаючы пытанне аб увасабленні тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў рэпертуары духавога аркестра трэба адзначыць, што ў першыя ваенныя гады цяжкіх выпрабаванняў узрасла значнасць і роля такога масавага жанру, як марш. Менавіта гэтыя музычныя творы савецкіх кампазітараў ваеннага перыяду аказалі на слухачоў, асабліва на байцоў, магутнае ўздзеянне -- эмацыянальнае, арганізацыйна-мабілізуючае. І па гэтай прычыне ваенна-патрыятычным маршам у час радыётрансляцыі ў гады Вялікай Айчыннай вайны была вызначана важная місія -- выкананне маршаў у гучанні духавых аркестраў асацыіравалася ў савецкіх людзей з пачаткам новага дня, маршы пастаянна ўключаліся ў літаратурна-драматычныя, палітычныя перадачы. Маршы абавязкова гучалі ў ранішніх паведамленнях Савінфармбюро. Акрамя гэтага, для слухачоў с п е ц ы я л ь н а рыхтаваліся радыёканцэрты, прысвечаныя маршавым творам, якія ужо атрымалі прызнанне, і толькі што напісаныя кампазітарамі. Характарызуючы значнасць і асаблівасці ўздзеяння марша на слухача, музыказнаўца В.Цукерман адзначаў, што "в марше есть возможности, благоприятные для интерпретации его в героическом плане: собранность, ритмическая и фоническая мощь, вполне доступное ему выражение волевого начала. Если все это сочетается со значительной мелодической и гармонической выразительностью, применением динамической формы, с художественно-тактичным использованием живописно-изобразительного начала, то оказывается, что марш вполне допускает такую степень драматизации, которая включает героические образы в пределы возможного"[19].

Вялікай заслугай аркестра пад кіраўніцтвам С.Чарнецкага стала дзейнасць па папулярызацыі велізарнай колькасці новых твораў, напісаных у гады вайны савецкімі кампазітарамі для духавога аркестра. Як указвае В.Цукерман, "продуктивность советских композиторов в области духовой музыки за время Великой Отечествен-

---

18 Баданова Г. Возвращение духового оркестра. Правда, 20 мая 1985. -- С. 3.

19 Цуккерман В.А. Произведения для духового оркестра. -- В кн.: Очерки советского музыкального творчества. -- С. 291.

ной войны была исключительна. И профессионалы марша, и композиторы, до сих пор лишь совершавшие экскурсы в сферу духовой музыки, и новички этого дела -- совместным трудом намного обогатили репертуар советской духовой музыки. Несмотря на большую разницу в летах /более 10 или 4 года!/, военная эпоха может рассматриваться как глава в истории советской духовой музыки, -- и, в частности, марша, -- не только вполне соизмерима с предшествующей /главой -- А.К./, но и в некоторых отношениях оставляющая её позади"[20].

Для духавога аркестра ў гады вайны актыўна піша маршы сам С.Чарнецкі. Яго творы ў гэтым жанры ўнеслі дастойны ўклад у справу перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі, аказваючы глыбокае патрыятычнае ўздзеянне на байцоў. Неабходна прыгадаць, якую высокую ацэнку творчасці С.Чарнецкага ў гэтым жанры даў адзін з вядучых кампазітараў М.И.Іваноў-Радкевіч: "С.Чернецкого можно считать непревзойденным мастером красноармейского марша в смысле придания ему специфически походного характера. Это сказывается не только в исключительной четкости и импульсивности ритма, но и в компактной, яркой инструментовке, чрезвычайно благодарной для исполнения марша на открытом воздухе"[21].

Акрамя С.Чарнецкага ў гады вайны плённа працуюць у жанры марша М.Чэмберджы, А.Хачатуран, Д.Саліман-Уладзіміраў, В.Руноў, Ю.Хайт, А.Дзегялёнак.

Калі ў цэлым характарызаваць творчасць гэтых кампазітараў, то трэба адзначыць, што ў іх маршавых творах тэма гераічнай барацьбы савецкага народа ў суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны знайшла яркае ўвасабленне. Безумоўна, новыя творы адрасаваліся ў першую чаргу абаронцам Радзімы, якія білі ворага на франтах вайны і ў тыле ворага. Гераічная барацьба савецкага народа, поспехі Чырвонай Арміі ў значнай ступені абумовілі з"яўленне вялікай колькасці маршаў, прысвечаных слаўным перамогам гвардзейскіх часцей, розных відаў войск*, а таксама садзейнічалі актыўнаму раз-

---

20 Цуккерман В.А. Произведения для духового оркестра. -- В кн.: Очерки советского музыкального творчества. -- С. 299.

21 Новые советские марши. Музыка, 16 марта 1937, № 4.

* з найбольш яркіх, мастацка-значных твораў гэтай тэматыкі адзначым "Марш гвардзейцаў-мінаметчыкаў", "Марш танкістаў" С.Чарнецкага.

віццю жанру марша як неад"емнага элемента службова-страявога ўжытку. І высокаідэйныя тэматычныя, і рытуальна-страявыя маршы з выражаным практычна-прыкладным накірункам неслі героіка-патрыятычнае натхненне, беззапаветную мужнасць і гарачую любоў да сваёй Радзімы.

Вяртаючыся да разгляду ўкладу ўказаных кампазітараў ва ўвасабленне ваеннай тэматыкі ў сваіх творах адзначым, што, напрыклад, лепшым гераічным маршам лічыцца твор "Слава гвардзейцам" М.Чэмберджы. Спецыялісты па вартасці ацанілі значнасць мужнасці і суровасці галоўнай тэмы гэтага марша і таму яна характарызуецца як своеасаблівая "тэма клятвы". Калі аналізаваць марш з музыказнаўчага пункту гледжання, то тут, у адрозненне ад традыцыйнага падыходу да напісання маршавых твораў, галоўная тэма не выкладаецца па прынцыпу кантрасту шляхам яе процістаўлення, а, наадварот, пры другім правядзенні тэма атрымлівае цікавае мастацкае развіццё, прычым кампазітар пры такім новым творчым падыходзе вырашае сваю задачу шляхам традыцыйнага прыёму: дыялог паміж басамі і першымі галасамі, функцыі якіх у дадзеным выпадку ў аркестры выконваюць карнеты. Не ўдаючыся ў далейшую дэталізацыю мастацкага рашэння дададзім, што гэты твор пакідае цэльнае ўражанне, выяўляючы ў вядомай ступені арыентацыю на сімфанізм.

Нацыянальная тэматыка знайшла ўдалае адлюстраванне ў маршы "Героям Айчыннай вайны" А.Хачатурана, у якім каларытна вырашаны падыход да выкладання фактуры -- спалучэнне басавых рэплік з эфектыўнымі гамападобнымі пасажамі у драўляных духавых інструментаў. Да вырашэння мастацкіх задач пры дапамозе звароту да нацыянальных тэм і інтанацый вызначаюцца і творы Д.Саліман-Уладзімірава -- "Марш уральскіх патрыётаў", песенны "Марш 3-й гвардзейскай дывізіі" з незвычайным вырашэннем формы напісання твора і выкарыстаннем пры вырашэнні пытання аб форме твора прыёмам, характэрным для джазавай музыкі: пры правядзенні рэпрызы галоўнай тэмы ідзе тэма трыо, і завяршаецца марш -- па аналагу з кароткім прыпевам, -- эфектным паўторам яркага кульмінацыйнага моманту.

Вядома, у гады Вялікай Айчыннай вайны папулярнасць маршаў была бясспрэчнай і гэтыя творы кампазітары у асноўным лічылі пісаць як чырвонаармейскія маршы. За гады вайны [illegible] маршаў побач з традыцыйнымі, значна пашыралася. З"явіліся святочныя,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гераічныя, народна-песенныя маршы, а таксама марш-адпачынак, марш-песня, марш-танец, скерцозны марш.

Страявым маршам удзяляю увагу В.Руноў, які стварыў больш за дзесяць "гвардзейскіх маршаў", і Ю.Хайт, які, выдатна валодаючы майстэрствам духавой інструментоўкі, поўнасцю ажыццяўляю свае творчыя пошукі ў галіне страявога марша, аб чым пераканаўча сведчаць яго маршы "Марская гвардыя", "Слава героям" і інш.

Асабліва трэба адзначыць і творчыя дасягненні А.Дзегялёнкі. Ім на прафесійным узроўні напісаны "Коннагвардзейскі марш", прысвечаны гераічным подзвігам кавалерыі.

Цяжкія выпрабаванні, што выпалі на долю савецкага народа ў гады вайны, радасць пераможных аперацый у многім актывізавалі творчасць М.Іванова-Радкевіча, з чым імем звязаны важкія дасягненні ў жанры духавой музыкі і ўмацаванне яе аўтарытэту ў слухачоў і кампазітараў. Характэрна, што за лепшыя свае маршы, напісаныя ў гады вайны -- марш на рускія народныя тэмы "Родная Масква", святочны "Пераможны марш", гераічныя маршы "Капітан Гастэла" і "Народныя мсціўцы", кампазітар у 1943 годзе атрымаў дзяржаўную прэмію, што з"явілася не толькі высокай ацэнкай яго творчасці, але і пацвярджэннем значнай ролі марша ў справе мабілізацыі савецкіх людзей на перамогу. У гэтых творах кампазітарам былі знойдзены своеасаблівыя мастацкія рашэнні. Так, напрыклад, лепшы з гераічных маршаў "Капітан Гастэла" падкупляе не толькі фанфарным каларытам трохгучнага меладычнага развіцця мелодыі з элементамі хрыматычнай драматызацыі, лірычнай тэмай трыо, але і агульным рамантычным раскрыццём тэматычнага твора, прысвечанага легендарнаму герою.

Індывідуальны творчы падыход праявіў кампазітар у час напісання марша "Народныя мсціўцы". М.Іваноў-Радкевіч здолеў стварыць жыва-пісныя тэматычныя эпізоды з жыцця партызанскага атрада. Адмовіўшыся ад традыцыйнага маршавага выкладання, якое ў творы праведзена толькі фрагментарна, кампазітар надаў меладычным галасам дакладную рытмічную пульсацыю маршападобнага характару, выкарыстаў нізкую тэсітуру басаў для выканання магутнай і сурова-стрыманай мелодыі народнага плана, эфектнае супастаўленне дынамічных кантрастаў пры напісанні тэмы трыо і яго рэпрызнае праведзенне на піяніссіма. Усё гэта максімальна сродкамі музычнага мастацтва дэманструе гераічную барацьбу партызан і той страх,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

які адчувалі нямецка-фашысцкія акупанты.

Духавая музыка, якая стала ў час вайны увасабленнем героіка-патрыятычных імкненняў савецкага народа, прыцягнула ў сваю сферу новых кампазітараў, якія да гэтага часу не звярталіся да гэтага жанру. Аданачым поспехі М.Ракава ў яго маршах "Доблесць", "За Радзіму", "У атаку", "Марш лётчыкаў", "Танкіст"; В.Мурадэлі -- у маршы "Наступленне", "Чарнаморцы", прысвечаным легендарным подзвігам ваенных маракоў, а таксама твор "Мора кліча" З.Кампанейца, "Баявыя сябры", "Вораг будзе разбіты", "Перамога за намі" М.Старакадомскага.

Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў творчасці савецкіх кампазітараў знайшла сваё адлюстраванне не толькі ў маршавых творах, якія займаюць дамінуючае месца ў жанры духавой музыкі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Не аналізуючы творы, створаныя ў выглядзе пералажэнняў, апрацовак, па прынцыпу папуры, спынімся на арыгінальных, гэта значыць задуманых і напісаных толькі для саставу духавога аркестра, творах цыклічнай формы ў духавой музыцы ваеннага перыяду.

Так, маючы добры практычны вопыт у перадваенны перыяд па напісанню сюіт на чырвонаармейскія тэмы[ж], М.Кручынін ужо ў верасні 1941 года піша яркую трэцюю "Чырвонаармейскую сюіту", якая пераканауча раскрывае пафас барацьбы савецкага народа пры дапамозе канкрэтнай тэматыкі частак: "Народная клятва", "Пісьмо на фронт", "За шчасце Радзімы". Чацвёртая сюіта, напісаная кампазітарам у 1943 годзе, прысвечана байцам кавалерыйскіх часцей. Гэтая сюіта, нягледзячы на даволі маштабны аб"ём, вельмі ўдалая і тэматычна, і вобразна-мастацкі, што раскрываецца ў кожнай з пяці яе частак /"Казацкая дума", "Конагвардзейская рысь", "Кавалерыйскі танец", "Кубанская-паходная", "Галоп і рубка".

З больш простых па форме аднач астковых твораў для духавога аркестра, што грунтуюцца на адначастковай санатнасці, аданачым адзін з лепшых твораў -- уверцюру "XXУ год Чырвонай Арміі", напісаной Р.Гліэрам у 1943 годзе.

З беларускіх кампазітараў, напрыклад, у гады Вялікай Айчын-

---

ж першая "Чырвонаармейская сюіта" /"Трапак", "Гапак", "Аурал", "Чырвонаармеец на адпачынку"/ напісана у 1937 г., другая аднайменная сюіта /"Родная зямля", "У паход", "[illegible]ны час і абавязак"/ -- у 1940 г.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

най вайны быў напісаны "Канцэртны марш" В.Залатаровым, што вызначаецца трыумфальна-гераічным пафасам і яркім аптымізмам, а пасля вызвалення Мінска П.Падкавырау, які вярнуўся з эвакуацыі, піша свой урачысты марш "Радасць перамогі".

Пасля Вялікай Айчыннай вайны працэс далейшага фарміравання героіка-патрыятычнай тэматыкі ў рэпертуары духавых аркестраў развіваўся неадназначна. Нельга сказаць, што гэта тэматыка не прысутнічала ў выступленнях калектываў. Інтэнсіўнасць і шырыня з"яўлення духавых аркестраў у пасляваенныя гады ў Беларусі была зайздроснай -- размах гэтай з"явы ў сферы аматарскай /самадзейнай/ творчасці парадзіў значны дэфіцыт кадраў, у выніку чаго духавыя аркестры ўзначальвалі /а часта нават і па некалькі калектываў адначасова/ ваенныя дырыжоры, што не магло адбіцца і на рэпертуары аркестраў. Калі звярнуцца да аналізу рэпертуару 1950-х гадоў, то ў Беларусі з твораў даследуемай тэматыкі ў выкананні аматарскіх калектываў гучалі такія творы, як "Развітанне славянкі" В.Агапкіна, "Пад зоркамі Балканскімі" М.Блантэра, вальс "На сопках Манчжурыі" І.Шатрова і інш.[22] Трэба заўважыць, што ў плане узбагачэння разглядаемай тэматыкі не сказалі сваё слова прафесійныя кампазітары Беларусі, якія не удзялялі сур"ёзную увагу[23]. А станоўчым прыкладам у плане папулярызацыі твораў героіка-патрыятычнага накірунку з"яўляецца, безумоўна, дзейнасць ваенных духавых аркестраў Беларусі. Т.к. з вялікага рэпертуару, які выконваўся гэтымі калектывамі ў 1950-ыя гады ў час правядзення марш-парадаў, канцэртных выступленняў, адзначым толькі выдатныя маршавыя творы С.Чарнецкага, якія карысталіся заслужанай папулярнасцю: "Марш танкістаў", "ГТА", "Марш мінамётчыкаў", "Салют Масквы", "Марш артылерыстаў" і інш., а таксама творы В.Блажэвіча, М.Чэмберджы, М.Іванова-Радкевіча і іншых кампазітараў. Акрамя гэтага, Саюзам кампазітараў Беларусі пачалі праводзіцца пасяджэнні ваеннай камісіі, на якіх арганізоўваліся прагляды і праслухоўванні партытур для духавых аркестраў розных саставаў, а на абмеркаванні запрашаліся ваенныя дырыжоры[24].

---

22 Цэнтр. дзярж. архіў-музей літаратуры і мастацтва Беларусі, ф. 79, воп. І, с. 67, л. І06--І07, І65--І66.

23 Там жа, ф. ІІ9, воп. І, с. І6, л. 8, І6, І8.

24 Там жа, ф. ІІ9, воп. І, с. 26, л. 3.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКіМ

Аданачым і той факт, што кампазітары спецыяльна адпраўляліся ў творчыя камандзіроўкі ў воінскія часці на перыяд летніх збораў, мэтай якіх з"яўлялася напісанне новых твораў да святаў Савецкай Арміі: Дня авіяцыі, Дня танкістаў, Дня артылерыста і да т.п. Створаныя лепшыя творы рэкамендаваліся для "исполнения ансамблем БВО, военными оркестрами и художественной самодеятельностью"[25]. Але нават нягледзячы на такія меры, рэпертуар калектываў усё ж заставаўся аднастайным у сілу яго дубліравання і паўтаральнасці. А з"яўленне новага твора адразу ж прыцягвала ўвагу слухачоў. Так, на Дэкадзе беларускай музыкі ў 1957 годзе слухачы цёпла прынялі ў выкананні аркестра Штаба ЧБВА марш "Канстанцін Заслонаў" А.Яроменкі[26]. У пачатку 1970-х гадоў з"яўляецца і твор А.Зарубкі "Да магілы герояў". Для параўнання дададзім, што савецкімі кампазітарамі ў гэты перыяд быў створаны даволі прадстаўнічы рэпертуар: Пятая сімфонія М.Іванова-Радкевіча, Чацвертая сімфонія Б.Кажэўнікава, сімфонія-паэма "Вогненныя гады", "Урачыста-гераічная ўверцюра" Г.Калінковіча, уверцюра "Памяць сэрца", паэма "Абеліск ля дарогі" В.Пятрова, паэма "Мамаеў курган" Д.Браслаўскага, "Гераічная ўверцюра" Д.Саліман-Уладзіміраза, "Гераічная ўверцюра" В.Кікты[27] і іншыя творы.

Аналізуючы разглядаемую праблему на сучасным этапе развіцця музычнай культуры Беларусі, адзначым, што слухачоў прыцягвае выкананне ваеннымі аркестрамі гераіка-патрыятычных твораў у час правядзення ўрачыстых воінскіх рытуалаў, конкурсных і канцэртных выступленняў. Максімальнае эмацыянальнае ўздзеянне на слухачоў аказвае гераіка-патрыятычны рэпертуар у час правядзення маштабных сацыяльна-значных мерапрыемстваў. У рэпертуары прафесійных, аматарскіх, навучальных і ваенных аркестраў уключаюцца не толькі маршавыя творы, пералажэнні папулярных твораў пе-

---

25 Цэнтр. дзярж. архіў-музей літаратуры і мастацтва Беларусі, ф. 119, воп. 1, с. 26, л. 4.

26 Там жа, с. 89, л. 2.

27 Щедрин Б. Некоторые вопросы музыкального языка концертных сочинений советских композиторов для духового оркестра 60--70 годов // В помощь военному дирижеру, вып. XVI. -- М., 1975. -- С. 77--122.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сеннага жанру, але і буйныя па форме творы. Так, аркестры часта звяртаюцца да выканання папуры на тэмы песень Вялікай Айчыннай вайны "Сябры-аднапалчане" И.Вахуцінскага, "Фантазіі на тэмы песень аб рэвалюцыі" і "Фантазіі на тэмы песень аб Перамозе" А.Тупіцына, "Фантазіі на тэмы рэвалюцыйных песень" Д.Саліманa-Уладзімірава, "Фантазіі на тэмы песень аб Радзіме і Арміі", "На славу Радзімы", "Фантазіі на тэмы песень Вялікай Айчыннай вайны" Б.Дзіева, фантазіі на тэмы песень У.Алоўнікава "Партызаны Беларусі" А.Амірава. Асаблівую папулярнасць заваявалі такія творы, як "Марш" Б.Акуджавы да кінафільма "Беларускі вакзал", "Вальс" К.Малчанава да кінафільма "А зоры тут ціхія". У рэпертуары духавых аркестраў даволі прадстаўнічыя шматлікія пераладжэнні героіка-патрыятычных твораў, у тым ліку і песень /несумненнымі лідэрамі тут выступаюць такія творы, як "Дзень Перамогі" Д.Тухманава, "Майскі вальс" і "Пісьмо а 45", "Радзіма" і песня-балада "Хатынь" І.Лучанка, "Насіце ордэны" Л.Захлеўнага і інш./. У пералічаным шэрагу твораў васлугоўвае увагу Уверцюра беларускага кампазітара У.Палуэктава "Прарыў".

На рубяжы 1970--80-х гадоў у плане асэнсавання значнасці героіка-патрыятычнай тэматыкі духавых аркестраў, удасканальвання формаў іх дзейнасці і пашырэнні сацыякультурных функцый, назіраецца прыкметны інтарэс, даецца некаторы аналіз, што знаходзіць адлюстраванне ў асобных публікацыях. Так, у 1977 годзе з'яўляецца даволі аб'ёмная /больш як 30 друкаваных аркушаў/ манаграфія "Савецкая ваенная музыка", выдадзеная ваенна-аркестравай службай Міністэрства абароны СССР. Асаблівасцям правядзення Святаў духавой музыкі прысвечана выданне Усесаюзнага навукова-метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветнай работы[28]. Гэтым жа выданнем былі выпушчаны метадычныя рэкамендацыі, якія садзейнічалі арыентацыі кіраўнікоў па пытаннях фарміравання героіка-патрыятычнай тэматыкі рэпертуару[29]. Улічваючы пашыраючыя маштабы масавых святаў, у тым ліку і марш-па-

---

28 Праздники духовой музыки / из опыта работы культурно-просветительных учреждений РСФСР, Белорусской ССР, Литовской ССР. -- М., 1979. -- [illegible] с.

29 Пропаганда советской патриотической песни и музыки. -- М., 1981. -- [illegible] с.



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

радаў, Святаў духавой музыкі, з'яўляюцца метадычныя рэкамендацыі па ўдасканальванню іх далейшай арганізацыі[30]. Важнае значэнне ў плане пашырэння неабходнай інфармацыі мелі і публікацыі мемуарнага характару. Адзначым, напрыклад, успаміны ваеннага дырыжора Г.С.Нагорнага "І полк пайшоу за трубачом" у адным з зборнікаў артыкулаў[31].

Ваенная музыка ў яе разнажанравай разнастайнасці стала і аб'ектам навуковых даследаванняў. Так, М.Трубнікаў сваю дысертацыю прысвяціў пытанням эстэтычнага выхавання воінаў[32]. Аднак ваідэалагізаваны ракурс аналізу аб'екта даследавання, канстатуюча-інфармацыйны і апісальны характар выкладання матэрыялу нават пры разглядзе музычных твораў увёў аўтара ў бок ад сур'ёзных праблем і аналітычных абагульненняў.

У дадзеным артыкуле мы не маем магчымасці ахапіць усю панараму героіка-патрыятычнага рэпертуару для духавога аркестра, але аналіз паказаў, што яго большае прадстаўніцтва назіраецца ў 1980- пачатку 1990-х гадоў. Разгледзім толькі некаторыя творы. Так, у зборніку "Канцэртныя п'есы савецкіх кампазітараў для духавога аркестра" уключана паэма В.Газарана "Памяць вогненных гадоў"[33]. Дырыжорам была прапанавана і тэматычная падборка з твораў А.Пахмутавай[34]. Творы прызнаных майстроў і сучасных аўтараў удала спалучаліся у зборніку "Мы -- Армія народа"[35], у якім побач з папулярным "Пераможным маршам" М.Іванова-Радкевіча маюць цікавасць новыя творы: "Мы -- Армія народа" Г.Маўсесяна, "Г.эр-

---

30 Массовые праздники самодеятельного музыкального искусства. -- М., 1981. -- 41 с.

31 На земле, в небесах и на море. Рассказывают фронтовики. Сб. статей. -- М., 1981.

32 Трубников Н.А. Военно-духовая музыка в системе идейно-эстетического воспитания советского воина: Автореф. дис. ...канд. искусствоведения. -- М., 1981. -- 21 с.

33 Концертные пьесы советских композиторов для духового оркестра. Вып. 5. -- Партитура. -- М.: Музыка, 1981.-- С.[illegible]

34 Пахмутова А. Вечная слава героям... Партитура. -- М.: Сов. композитор, 198[illegible]. -- 35 с.

35 Мы -- Армия народа. Марши для духового оркестра. Партитура. -- М.: Музыка, 1988. -- 128 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

двейская слава" В.Гардзеева, "Заусёды у страі" Л.Мадзікава. Другім удалым прыкладам тэматычнай кампаноўкі з"яўляецца партытура, у якую былі ўключаны найбольш вядомыя масаваму слухачу творы, як "Дарогі" А.Новікава, "Нам патрэбна адна Перамога" Б.Акуджавы з кінафільма "Беларускі вакзал", "Дзень Перамогі" Д.Тухманава, песня "У дарогу" В.Салаўёва-Сядога з кінафільма "Максім Перапяліца" і інш.[36] Асаблівую цікавасць уявіла падборка твораў серыі "Старадаўнія маршы для духавога аркестра". Першы выпуск аб"яднаў найбольш раннія творы, такія як "Егерскі марш", марш "Герой", марш "Грэнадзёр", "Марш Пячорскага палка", "Парыжскі марш", "Бой пад Лялянам" В.Яфанава[37]. У другім выпуску дырыжоры маглі ўжо сабе выбраць больш вядомыя старадаўнія маршы, сярод якіх даволі папулярны, падкупляючы сваёй прыгажосцю і грацыёзна-узлётным рухам мелодыі марш Н.Трафімава "Туга па радзіме", "Пятроўскі марш", які вядомы яшчэ як "Марш Праабражэнскага палка", напорыста-тэмпераментны "Скоры марш № 5" А.Сакалова, інструментальная версія вельмі вядомай рускай народнай песні "Барадзіно" ў апрацоўцы С.Ганічава і іншыя творы[38]. Не менш цікавая падборка была і ў трэцім выпуску гэтай серыі. Сярод твораў -- "Марш 27-га драгунскага Кіеўскага палка" Глінкі, "Марш Саратаўскага палка", "Салдацкая доблесць" Ф.Блона, "Развітанне гладыятараў" Х.Бланкенбурга і інш.[39] Нельга абысці і выданне Пермскага абласнога навукова-метадычнага цэнтра ў выглядзе цыкла гутарак-канцэртаў аб такіх творах, як "Развітанне славянкі" В.Агапкіна, "Капітан Гастэла" М.Іванова-Радкевіча, "Панфілаўцы" Я.Русанава, "Франтавы марш" С.Вараб"ёва[40].

У пачатку 1990-х гадоў таксама з друку працягвалі выхо-

---

36 Солдаты мира. Песни и пьесы для духового оркестра. Партитура. -- Ленинград: Музыка, 1988. -- 79 с.

37 Старинные марши для духового оркестра. Партитура. -- М.: Музыка, 1984. -- [illegible].

38 Старинные марши для духового оркестра. Вып. 2. Партитура. -- М.: Музыка, 1987. -- [illegible] с.

39 Старинные марши для духового оркестра. Вып. 3. Партитура. -- М.: Музыка, 1989. -- 96 с.

40 Играет духовой оркестр. /Цикл бесед-концертов о духовой музыке/. Автор-составитель В.И.Лицман. -- Пермь, 1983.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дэіць партытуры, якія тэматычна выдзяляліся як зборнікі гераіка-патрыятычных твораў. Гэта ў многім дапамагала кіраўнікам калектываў, асабліва аматарскіх, мець неабходны музычна-тэматычны матэрыял для ўрачыстых выступленняў сваіх духавых аркестраў. Возьмем, напрыклад, зборнік "Парад Перамогі"[41]. Прапанаваныя творы дазваляюць кіраўніку зрабіць выбар, зыходзячы з узроўню выканальніцкай падрыхтоўкі яго музыкантаў. Больш падрыхтаваныя калектывы маглі звярнуцца да твораў майстроў духавой музыкі: "Пераможны марш" М.Іванова-Радкевіча, "Парад" С.Чарнецкага, "Гвардзейскі марш" В.Рунова, а астатнія -- да такіх твораў, як "Франтавік" К.Маскаленкі, "Слава гвардзейцам" М.Чэмберджы, фанфарнага марша "Парад" П.Шпітальнага. Своеасаблівым падарункам музыкантам духавых аркестраў было і выданне "Урачыстага марша" Чайкоўскага. Характэрна тое, што пералажэнне, выкананае С.Ганічавым, дазваляла выконваць гэты славуты твор нават малым змешаным саставам аматарскага калектыву, прычым, пры неабходнасці, і ў скарочаным варыянце[42].

Што датычыцца выдання гераіка-патрыятычнага рэпертуару для духавых аркестраў у рэспубліцы, то тут карціна не такая ўжо радасная. Эпізадычна такія творы ўключаліся ў зборнікі, выдаваемыя Рэспубліканскім навукова-метадычным цэнтрам. Так, у зборнік 1974 г. па разглядаемай намі тэматыцы ўвайшлі такія творы, як "Няхай жыве наша дзяржава" Б.Аляксандрава, Фантазія А.Амірава "Партызаны Беларусі" на тэмы песень У.Алоўнікава, "Песня пра далёкую Радзіму" М.Тарывердзіева з тэлефільма "Семнаццаць імгненняў вясны", "Стары марш" Л.Лядавай[43]. У зборнік 1984 года былі ўключаны толькі тры аналагічныя творы: "Радзіме" І.Лучанка, "Насіце ордэны" Л.Захлеўнага і песня-балада "Хатынь" у інструментоўцы З.Гаварухіна[44].

---

41 Парад Победы. Марши для духового оркестра. Партитура.-- М.: Музыка, 1990. -- 94 с.

42 Чайковский П. Торжественный марш. Переложение для духового оркестра. Партитура и голоса. -- М.: Музыка, 1990.

43 Играет духовой оркестр художественной самодеятельности. Вып. 2. Партитура. -- Мн., 1974. -- 359 с.

44 Играет духовой оркестр. Репертуарный сборник. Партитура. -- Мн., 1984. -- 176 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Разглядаемая намі тэматыка не знайшла свайго шырокага адлюстравання і ў зборніках выдавецтва "Беларусь" -- "Музыка для духавога аркестра" і "Рэпертуар духавога аркестра". У першай назве зборніка ў выпуску 1981 года была апублікавана "Песня пра Дзавтара" У.Алоўнікава, а ў другой -- "Армія мая" А.Абрамава, марш на тэму песні І.Лучанка "Пісьмо з 45-га" ў апрацоўцы М.Берсана і песня Л.Захлеўнага "Насіце ордэны"[45], якая ўжо упаміналася ў зборніку рэспубліканскага НМЦ народнай творчасці і КАР.

Аналізуючы сучасны стан рэпертуару духавых аркестраў, звернем увагу на той факт, што ў Расіі, на Украіне, у Беларусі, Літве, Латвіі, Эстоніі традыцыйна праводзімыя святы духавой музыкі і як скарочаная іх форма -- марш-парад, з"яўляюцца найбольш эфектыўнай і перспектыўнай папулярызацыяй гераіка-патрыятычных музычных твораў. У Расіі, напрыклад, найбольш яркавыражаная гераіка-патрыятычная накіраванасць такіх святаў характэрна для Валгаграда, дзе, пачынаючы з 1970-х гадоў, у падобных мерапрыемствах удзельнічаюць аматарскія навучальныя і ваенныя аркестры воінскіх часцей, курсантаў ваенна-дырыжорскага факультэта пры МДОЛК імя П.І.Чайкоўскага, а таксама запрошаныя ваенныя аркестры з розных краін. Актыўна развівала рэвалюцыйныя, баявыя, працоўныя і культурныя традыцыі і свята духавой музыкі ў Іванаве, якое з"яўлялася пралогам Усесаюзнага традыцыйнага фестывалю мастацтваў "Чырвоныя гваздзікі".

Падкрэслім, што гераіка-патрыятычная, антываенная тэматыка ў рэпертуары духавых аркестраў займала вядучае месца на рэспубліканскіх святах і марш-парадах, праводзімых у Мінску /1971, 1973, 1975, 1977, 1987, 1989, 1993 гг.; у 1993 г. кульмінацыйны пункт рэспубліканскага свята усё ж быў не ў Мінску, дзе таксама праводзілася Свята духавой музыкі, а ў Брэсце, куды для выступлення былі запрошаны творчыя дэлегацыі ад абласцей рэспублікі/.

Разгледзім, напрыклад, рэпертуар, які быў падрыхтаваны удзельнікамі заключнага канцэрта першага мінскага абласнога конкурсу і Свята духавой музыкі, якое паралельна праводзілася па праграме Усесаюзнага конкурсу ВЦСПС і Саюза кампазітараў СССР.

---

45 Репертуар духового оркестра. Партитура. -- Мн.: Беларусь, 1984. -- 63 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У ліпені 1971 г. тут гучалі такія творы, як марш "Канстанцін Заслонаў" Гарбара /духавы аркестр Палаца культуры БелАЗа з Жодзіна пад кіраўніцтвам Э.Сінкевіча/, "Маладая гвардыя" А.Новікава /дырыжор І.Вайніловіч/, "Радзіма, мая дарагая" У.Алоўнікава /дырыжор Э.Танклеўскі/, "Песня пра Радзіму" І.Дунаеўскага /дырыжор -- заслужаны артыст рэспублікі А.Майзлер/. Як бачым, кола твораў героіка-патрыятычнай тэматыкі не вельмі шырокае. Такая ж карціна склалася і ў праграме зводнага саставу аркестра на першым Рэспубліканскім марш-парадзе духавых аркестраў у рамках заключнага тура першага Рэспубліканскага агляду-конкурсу самадзейных духавых аркестраў. Крыху лепшае становішча з такім накірункам рапертуару склалася на рэспубліканскім Свяце ў 1973 годзе. Даволі сур"ёзныя адносіны дырыжораў да пытанняў фарміравання рэпертуару героіка-патрыятычнага накірунку адбыліся напярэдадні падрыхтоўкі да рэспубліканскага Свята 1975 года, калі вясной 1974 г. на месцах праводзіліся ў рамках абласцей свае мерапрыемствы, прысвечаныя 30-годдзю вызвалення рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Так, у гэтую падрыхтоўку актыўна ўключыліся аркестры Гомельскай вобласці. На высокім узроўні тут папярэдне былі праведзены агляды на ўзроўні раёнаў. Гэта дазволіла праверыць выканальніцкую падрыхтоўку калектываў, офарміраваць іх тэматычна вытрыманы рэпертуар. У выніку такога падыходу на заключным свяце ў Гомелі зводным духавым саставам вобласці выконваліся такія творы, як "Марш танкістаў" С.Чарнецкага, "У лесе прыфрантавым" М.Блантэра, заключны хор "Слаўся" з оперы Глінкі "Іван Сусанін", "Лясная песня" У.Алоўнікава і інш. Характэрна, што сярод твораў абавязковай праграмы аркестры Брэсцкай вобласці рыхтавалі пераможны марш "Слава Радзіме" С.Чарнецкага, які вызначаецца не толькі маляўнічай, прыгожа-захапляючай мелодыкай, насычанай гармоніяй, тэматычным увасабленнем, але і значнымі тэхнічнымі, аркестрава-ансамблевымі цяжкасцямі. Падкрэслім не менш каштоўны выбар твораў аркестрамі Магілёўскай вобласці -- сярод усяго рэпертуару выдзяляецца марш В.Агапкіна "Развітанне славянкі".

Даволі прадстаўнічая панарама разглядаемай намі тэматыкі была прадстаўлена ў 1975 г. аркестрамі на другім Рэспубліканскім Свяце духавой музыкі і праводзімым паралельна другім Рэспубліканскім конкурсе калектываў. Так, на свяце ў рэпертуары аркест-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раў гучалі такія творы, як "Песня пра Савецкую Армію" /зводны духавы аркестр Гомельскай вобласці, дыр. А.Новікаў/, "У лесе прыфрантавым" М.Блантэра /зводны духавы аркестр Мінскай вобласці, дыр. Ю.Дзмітрыенка/, пераможны марш "Слава Радзіме" С.Чарнецкага /зводны духавы аркестр Брэсцкай вобласці, дыр. У.Майгула/, "Стары марш" Л.Лядавай /зводны духавы аркестр Гродзенскай вобласці, дыр. В.Зуеў/, "Айчына, мая дарагая" У.Алоўнікава, Фантазія А.Амірава "Партызаны Беларусі" /зводны духавы аркестр Віцебскай вобласці/, "Развітанне славянкі" В.Агапкіна, "Гімн вялікаму гораду" Р.Гліэра /зводны духавы аркестр Магілёўскай вобласці, дыр.: М.Скрыпёў, заслужаны дзеяч культуры М.Салдатаў/, "Камсамольскае юнацтва" І.Лучанка ў апрацоўцы А.Майзлера /зводны аркестр Мінска, дыр. В.Танклеўскі/. Свята завяршылася выступленнем зводнага духавога аркестра рэспублікі, у рэпертуары якога прагучалі такія творы, як "Няхай жыве наша дзяржава" Б.Аляксандрава /дыр. -- заслужаны артыст рэспублікі А.Пілібін/, "Марш танкістаў" С.Чарнецкага, "Лясная песня" У.Алоўнікава /дыр. -- заслужаны артыст рэспублікі А.Майзлер/ і інш. А ў зале Белдзяржфілармоніі на заключным канцэрце другога Рэспубліканскага конкурсу праграмы калектываў уключалі такія творы, як "Танец паўстаўшых баскаў" з балета Б.Асаф'ева "Полымя Парыжа", "Урачысты марш" Чайкоўскага, сімфанічная паэма "Васіль Цёркін" М.Багаслоўскага і інш. У фінале гэтага канцэрта зводным аркестрам рэспублікі была выканана фантазія М.Рэвуцінскага на тэмы песень Вялікай Айчыннай вайны "Сябры-аднапалчане", "Лясная песня" У.Алоўнікава, "Марш танкістаў" С.Чарнецкага, "Няхай жыве наша дзяржава" Б.Аляксандрава і інш.

Тэматыка, якая цікавіць нас, была прадстаўлена і на першым Усесаюзным свяце духавой музыкі, калі лепшыя духавыя аркестры краіны і шэраг замежных творчых калектываў у маі 1977 года сабраліся ў Мінску. У гэты ж час праводзілася і чарговае трэцяе Рэспубліканскае свята духавой музыкі. Прэса адзначала поспехі калектываў у плане ўдалага фарміравання рознажанравага рэпертуару, асабліва ўключэнне ў праграмы класічных твораў[46], што было безумоўнай заслугай кіраўнікоў калектываў.

---

46 Дербышева Т. Нет, не умер духовой оркестр // Сов.культура. -- 1977. -- 10 июня.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

З прыведзенага далей матэрыялу відаць, што амаль кожны калектыў не абышоў увагай героіка-патрыятычную тэму /мы нават выключылі такія творы, што пастаянна паўтараюцца ў праграмах калектываў, як "Дзень Перамогі" Д.Тухманава, папуры на тэмы песень Вялікай Айчыннай вайны "Сябры-аднапалчане" М.Вахуцінскага /. Сярод твораў, якія цікавяць нас, адзначым наступныя: "Памяць сэрца" І.Лучанка /духавы аркестр Аксайскага раённага Дома культуры Растоўскай вобласці/, "Фанфарны марш" М.Вахуцінскага і марш "Пад Чырвоным сцягам" К.Гарбара /народны духавы аркестр Ражскага раённага Дома культуры Разанскай вобласці/, Фантазію на тэмы песень Вялікай Айчыннай вайны Б.Дзіева /Народны духавы аркестр Сігнаеўскага сельскага Дома культуры Шпалянскага раёна Чаркаскай вобласці Украінскай ССР/, "На славу Радзімы". Канцэртная фантазія на тэмы песень аб працоўнай доблесці М.Вахуцінскага /Народны духавы аркестр Палаца культуры гарнякоў Сакалоўска-Сарбайскага горна-узбагачальнага камбіната г.Рудый Казахскай ССР/, "Полечка-поле" Л.Кніпера /Духавы аркестр музычна-харэаграфічнага таварыства і раённага Дома культуры Цулукідзеўскага раёна Грузінскай ССР/, Фантазія на рэвалюцыйныя тэмы Д.Саліман-Уладзіміравa /Духавы аркестр Палаца культуры і спорту Каўнаскага завода штучнага валакна Літоўскай ССР/, Фантазія на тэмы песень аб Перамозе А.Тупіцына /Народны духавы аркестр ордэна "Знак Пашаны" калгаса імя Мічурына Лазоўскага раёна Малдаўскай ССР/, Пераможны марш "Слава Радзіме" С.Чарнецкага, "Стары марш" Л.Лядавай /Духавы аркестр Дома культуры г. Кара-Балты, Кіргізская ССР/, уверцюра да драмы "Эгмант" Л.Бетховена /Духавы аркестр Хаджанцкага раёна Ленінабадскай вобласці Таджыкскай ССР, Фантазія на тэмы марскіх песень Р.Маладцова /Духавы аркестр Ерэванскага вытворчага аб"яднання "Армхіммаш" Армянскай ССР/, Вальс з кінафільма "А зоры тут ціхія" К.Малчанава /Аб"яднаны духавы аркестр Дома культуры г.Небіт-Дага і інстытута "Туркменгіправадгас" г.Ашхабада, Туркменскай ССР/, "Урачысты марш" П.Чайкоўскага, "Успамін аб палкавым аркестры" Ю.Гуляева /Духавы аркестр Магілёўскага вытворчага аб"яднання "Хімвалакно"/. Мы можам толькі адзначыць, што на заключным канцэрце гэтага грандыёзнага форуму духавых аркестраў краіны і прадстаўнікоў зарубежжа, а таксама беларускіх калектываў, зводны аркестр, які налічваў 1.800 выканаўцаў, пад кіраўніцтвам народнага артыста рэспублікі Б.Пенчука эфектна пра-

дэманстравау майстэрства у фанфарным маршы С.Чарнецкага "Слава Радзіме". Гэта быу і якасна-выканальніцкі, і мастацка-вобразны, і тэматычна дакладны паказчык прафесійнага узроуню выканаупау на духавых інструментах, а таксама высокая ступень уласаблення аутарскай задумы.

Калі ужо гаварыць аб яркай канцэнтрацыі тэматыкі высокага грамадзянскага і героіка-патрыятычнага пафасу, то трэба адзначыць даволі удалае правядзенне у 1978 годзе свята "Мы твае трубачы, рэвалюцыя", у якім галоуны рэжысёр П.Гуд не толькі дакладна збалансавау тэматычную накіраванасць рэпертуару духавых аркестрау, але і у п е р ш ы н ю у структуру ужо традыцыйнага свята духавой музыкі увёу кідкія элементы тэатралізацыі.

Гэты ж падыход, але у больш дасканалым выглядзе, быу прадэманстраваны П.Гудам у 1987 годзе на чацвёртым Рэспубліканскім свяце духавой музыкі, якое было праведзена у форме маштабнага тэатралізаванага прадстаулення /тэатралізаваны, з ярка касцюміраванымі знаходкамі, марш-парад, "гала-канцэрт", вялікае мастацка-спартыуное прадстауленне "Рэвалюцыі вечны агонь" на стадыёне "Дынама", тэматычныя канцэрты калектывау на розных эстрадах сталіцы і г.д./.

Уражліва і на высокім творчым уздыме марш-парады і святы духавой музыкі былі праведзены у гарадах рэспублікі у дні святкавання 40-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікау і 40-годдзя Перамогі савецкага народа у Вялікай Айчыннай вайне, а таксама у рамках арганізаванага у гэты ж час Усесаюзнага агляду самадзейнай мастацкай творчасці працоуных. Само сабой зразумела, што сама тэматычная накіраванасць гэтых своеасаблівых творчых справаздач калектывау у многім садзейнічала узмацненню значнасці гістарычнага і гераічнага подзвігу савецкага народа у Вялікай Айчыннай вайне, актывізацыі грамадскай увагі да дзейнасці духавых аркестрау і павышэнню і у кіраунікоу аркестрау, і у выканаупау пачуцця адказнасці за сацыяльную прэстыжнасць жанру духавой музыкі. Апрача гэтага, як актывізуючы фактар развіцця духавога аркестравага выканальніцтва асабліва адзначым і стварэнне за перыяд падрыхтоукі гэтых свят. новых калектывау /дзіцячы духавы аркестр Кобрынскага РСХТ у колькасці 26 чалавек, кіраунік В.Юшко; дзіцячы духавы аркестр Палаца культуры Брэсцкага аблсаупрофа у колькасці больш як 20 чалавек, кі-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раунік А.Аляксандрау і інш./.

На падставе статыстычных даных, сабраных у Рэспубліканскім Доме мастацкай творчасці Белсаўпрофа у гэты час, ніжэй прыводзіцца табліца, якая ілюструе удзел калектываў з колькасцю аркестрантаў у святах духавой музыкі, што адбыліся у абласных цэнтрах:

Табліца № I

| Назва абласцей | Колькасць аркестраў | Колькасць удзельнікаў | Агульная колькасць аркестраў па рэспубліцы | Агульная колькасць удзельнікаў калектываў па рэспубліцы |
|---|---|---|---|---|
| Брэсцкая вобласць | I0 | 300 | | |
| Віцебская вобласць | I0 | 300 | | |
| Гродзенская вобласць | 6 | I05 | | |
| Гомельская вобласць | I3 | 3I6 | | |
| Мінская вобласць | I8 | 4I3 | | |
| Магілёўская вобласць | I2 | 325 | | |
| | | | 69 | I.759 |

Даныя, прыведзеныя у табліцы, патрабуюць некаторага каментарыя. Улічваючы тое, што для правядзення марш-парадаў саставы аркестраў фарміраваліся па строгаму прынцыпу пастраення шарэнг і радоў, колькасць удзельнікаў, сярод якіх былі і тыя, хто не трапіў па гэтай прычыне у аркестр, магла быць значна большай. Да гэтага дабавім і сам факт правядзення напярэдадні урачыстасцей у абласных цэнтрах і святы у маштабе вобласці. Так, напрыклад, у Брэсцкай вобласці такія святы і марш-парады адбыліся у Баранавічах, самім Брэсце, Пінску, Пружанах. У іх прынялі удзел 42 калектывы з агульнай колькасцю аркестрантаў I.007 чалавек. Такім чынам можна зрабіць выснову аб больш значным размаху правядзення гэтых мерапрыемстваў усіх узроўняў.

Калі аналізаваць рэпертуар, які быў падрыхтаваны для гэтых урачыстасцей, то у гэтым плане прасочваецца выразная тэндэнцыя адбору твораў. Так, для выканання твораў у руху на марш-парадах аркестры аддавалі перавагу такім творам, як "Дзень Перамогі" Д.Тухманава, "Развітанне славянкі" В.Агапкіна, "Марш танкі-

стаў" С.Чарнецкага, "Юбілейны марш" Я.Глебава, "Нам патрэбна адна перамога" Б.Акуджавы, "Песня пра Савецкую Армію" А.Аляксандрава і інш. Што датычыцца канцэртнага рэпертуару, то тут дамінавалі наступныя творы: фанфарны марш "Слава Радзіме" С.Чарнецкага, фантазія А.Амірава "Партызаны Беларусі" на тэмы песень У.Алоўнікава, "Успамін пра палкавы аркестр" Ю.Гуляева, "Барадзіно" ў інструментоўцы М.Хаўкіна, фантазія Б.Рунова "Эх, дарогі", папуры на тэмы песень Вялікай Айчыннай вайны М.Вахуцінскага "Сябры-аднапалчане", "Няхай жыве наша дзяржава" Б.Аляксандрава, "Калі б камні маглі гаварыць" І.Лучанка і інш.

Аналізуючы вялікі матэрыял па правядзенню святаў духавой музыкі і марш-парадаў у рэспубліцы, можна канстатаваць, што ў нас у гэтым плане склаліся добрыя традыцыі, вызначыліся свае асаблівасці. Так, у Гомелі аркестры арыентуюцца ў асноўным толькі на героіка-патрыятычныя творы, у Мазыры духавыя аркестры праводзяць марш-парады і ўдзельнічаюць у правядзенні свята ваенна-патрыятычнай песні, у Брэсце свята духавой музыкі арганічна ўплятаецца ў традыцыйнае свята музыкі, песні і танца "Брэсцкая вясна".

У рамках нашага даследавання асаблівае месца займаў аналіз творчай дзейнасці ваенных духавых аркестраў, іх папулярызацыя твораў героіка-патрыятычнага накірунку. Гэтая своеасаблівая творча-тэматычная дамінанта пастаянна прысутнічае ў аркестрава-службовай і канцэртна-выканальніцкай дзейнасці гэтых калектываў. Асаблівая ўвага слухачоў да прафесійнай і мастацка-выканальніцкай дзейнасці праяўляецца не толькі ў час канцэртных выступленняў, але і ў час правядзення уражліва-эфектных марш-парадаў, Святаў ваеннай духавой музыкі. Першае такое свята "Музыка на службе абаронцаў Радзімы" на рэспубліканскім узроўні адбылося ў 1982 годзе. Падзеяй у музычнай культуры Беларусі стала правядзенне ў 1985 годзе агляду-конкурсу вядучых аркестраў Беларускай ваеннай акругі, прысвечанага 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Лепшыя ваенныя духавыя аркестры рэспублікі ў канцэртнай зале Мінскага Акруговага Дома афіцэраў сабралі прадстаўнічую аўдыторыю, якая была прадстаўлена не толькі спецыялістамі жанру, але і сапраўднымі аматарамі духавой музыкі. Ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, людзі старэйшага пакалення, слухаючы творы свайго часу вярталіся ў памяці да гадоў свайго

юнацтва. А моладзь, якая прысутнічала на канцэртна-конкурсных выступленнях, міжволі адчувала асаблівы эмацыянальны ўздым, вастрыню высокага пачуцця грамадзянскасці. Больш падрабязна аналіз гэтай своеасаблівай справаздачы ваенных музыкантаў намі быў разгледжаны на старонках перыядычнага друку, што і дапоўніць гэтае даследаванне[47]. Спынімся толькі на заключным канцэрце, які адбыўся пасля гэтага агляду-конкурсу, калі пасля выступлення пераможцаў у другім аддзяленні сцэна была прадастаўлена калектыву аркестра Штаба Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі, які адзначаў у тыя дні сваё 35-годдзе. З асаблівай увагай аўдыторыя рэагавала на героіка-патрыятычныя творы: "Фантазію на тэму песень франтавых гадоў" В.Каралёва, якая ўключала мелодыі славутых песень "Эх, дарогі", "Цёмная ноч" і інш.; "9 Мая" В.Волкава; "Раманс" К.Малчанава з кінафільма "А зоры тут ціхія"; "Нашага юнацтва аркестр" П.Аеданіцкага; "Так да нас прыйшла Перамога" Э.Зарыцкага і інш. Улічваючы ўсю адказнасць, якую нясуць і дырыжоры, і самі аркестранты за мастацка-якасны бок выконваемых героіка-патрыятычных твораў, адзначым, што не ўсё у гэтым плане было выканана. Так, напрыклад, салістам-вакалістам не ўдалося на належным узроўні выканаць папуры "Песні, абпаленыя вайной".

Пасля правядзення гэтага агляду-конкурсу поўную цікавасць выклікала і правядзенне традыцыйнага свята "Армейскія трубы гучаць". На гэтым свяце слухачы з асаблівым захапленнем успрымалі то хвалюючае відовішча ваенна-аркестравай службы, якая схавана ад недасведчаных вачэй і асаблівым сэнсам і пафасам напаўняе будні арміі. Незабыўнай падзеяй у жыцці арміі з"яўляецца рытуал прыняцця ваеннай прысягі. Адзначым, што любы воінскі рытуал немагчымы без музыкі, якая даўно ўжо стала не проста суправаджэннем, а найважнейшай яго часткай, што арганічна аб"ядноўвае ў адзінае ўрачыстае відовішча ўсю сукупнасць кампанентаў рытуалу.

Калі на ўрачыстых ваенных парадах абаронцы Радзімы дэманструюць сваю выпраўку, магутную тэхніку, раўнадушных сярод гледачоў няма, як і няма іх у час выканання зводным аркестрам заключнага хору "Слаўся" Глінкі з оперы "Іван Сусанін" пад гучнае

---

47 Карацееў А. Сення мы не на парадзе... // Мастацтва Беларусі. -- 1986, № 2. -- С. 60--62.

воінскае "Ура!". Гэта своеасаблівая кульмінацыя ўсяго параду. Нямногім даводзілася ўбачыць падкрэслена-урачыстую строгасць рытуалу развода і змены караула ў воінскіх часцях. Але слухачы беспамылкова могуць вызначыць фрагмент мелодыі І.Дунаеўскага "Песня пра Радзіму", які арганічна ўплятаецца ў маналітную музыку рытуалу "Развод караула" Каценкі. Многім слухачам не ў навіну было на гэтым свяце пазнаёміцца і з музыкай рытуалу "Павестка для ўрачыстай зары" і "Зара", якія гучаць у воінскіх часцях на агульнай вячэрняй паверцы у дні святаў. Пераканаўчым эпілогам свята было выкананне марша "Несакрушальная і легендарная", а агульнай кульмінацыяй грандыёзнага выступлення зводнага духавога аркестра, што ўключаў у сябе вядучыя калектывы рэспублікі, якія сталі пераможцамі агляду-конкурсу "Музыка ў баявым страі", з"явілася выкананне ўрачыста-велічнага твора Б.Аляксандрава "Няхай жыве наша дзяржава"*.

Завяршаючы аналіз дзейнасці ваенных духавых аркестраў і іх героіка-патрыятычнага рэпертуару, адзначым, што сярод усіх калектываў уклад аркестра Штаба ЧБВА у справу патрыятычнага і эстэтычнага выхавання людзей, асабліва моладзі, вельмі высокі[48]. Дададзім, што ён прымаў самы актыўны удзел у рабоце выязнога ХП Пленума Усесаюзнай камісіі ваенна-патрыятычнай музыкі Саюза кампазітараў СССР, які праходзіў у 1981 годзе ў Мінску[49]. Акрамя гэтага, менавіта аркестр Штаба ЧБВА запрашаўся для адкрыцця у Мінску Ўсесаюзнай Вахты памяці, а таксама і на ўсе іншыя найважнейшыя мерапрыемствы падобнага роду рэспубліканскага значэння.

Абраўшы аб"ектам сваіх даследаванняў героіка-патрыятычную тэматыку ў рэпертуары духавых аркестраў, мы не проста спрабавалі р э к а н с т р у я в а ц ь працэс яе фарміравання і вызначыць у ім асноўныя тэндэнцыі. Гэтыя задачы намі вырашаліся з адной толькі мэтаю -- паказаць і даказаць значнасць героіка-патрыятыч-

---

* Больш падрабязна пра гэта свята глядзіце у нашай публікацыі: Армейскія трубы гучаць... // ЛіМ, 21 лютага 1986.-- С.13.

48 [illegible] А. Не толькі маршы... // Мастацтва Беларусі. -- 1985, № 6. -- С.66-68.

49 Михайлов Э. О нашей Армии, для нашей Армии. Заметки о [illegible] военно-патриотической музыки Союза композиторов СССР // Музыкальная жизнь. -- 1982, № 3. -- С. 1.



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

най тэматыкі ў творчасці духавых аркестраў, бо яны яе увасабляюць больш пераканаўча, чым іншыя выканаўцы, у сілу сваіх тэмбрава-каларыстычных, дынамічна-кантрасных асаблівасцей і мастацка-эмацыянальнага ўздзеяння на слухачоў. Нельга не браць пад увагу вядомую долю скептыцызму і асобных аматараў, і спецыялістаў жанру духавой музыкі ў адносінах да гэтай тэматыкі. Гэта абумоўліваецца ў першую чаргу тым, што духавыя аркестры, дзякуючы сваім арганізацыйна-мабілізуючым магчымасцям, ідэальна ўпісваліся у мадэль культурнага жыцця грамадства, зададзенай самой дзяржавай з яе актыўным пошукам эфектыўных рычагоў ідэалагічнага ўздзеяння на чалавека. Гэта неадназначна і супярэчліва адбівалася на працэсе фарміравання героіка-патрыятычнай тэматыкі рэпертуару духавых аркестраў, падштурхоўвала да кампрамісу: кампазітараў -- да стварэння, а дырыжораў -- да папулярызацыі, заідэалагізаваных твораў, насуперак мастацкім уяўленням і перакананням. Возьмем, напрыклад, "захапленне" аркестрамі песняй-маршам "Малая зямля" А.Пахмутавай, твора, які быццам бы і падкупляе сваёй лірычнай задушэўнасцю, меладычнай пластыкай, але ў той жа час выпадае з агульнага шэрагу, калі яго ацэньваць па строгіх аб"ектыўных крытэрыях, паколькі змест песні быў з"арыентаваны на празмернае ўхваленне асобнага эпізода Вялікай Айчыннай вайны ў сілу агульнавядомых прычын. Як яркая процівага такім творам -- славуты "Дзень Перамогі" Д.Тухманава.

Нельга абысці ўвагай і пытанне, калі і кім выкарыстоўваецца героіка-патрыятычная тэматыка рэпертуару духавых аркестраў і якое гэта мае сацыяльнае значэнне і рэзананс. Напрыклад, пад гукі маршаў гэтай тэматыкі ўздымаўся дух войск у царскай стаўцы, якія маршыравалі з аркестрам у 1917 годзе па цэнтральнай вуліцы Магілёва[50]. Аналагічныя творы з неменш патрыятычным напалам узнімалі рэвалюцыйны дух чырвонаармейцаў. Мы з пункту гледжання героіка-патрыятычнага зместу разгледзелі стан рэпертуару аркестраў на сучасным этапе. Як і выконваемыя без разбору духавымі аркестрамі маршы царскай арміі для актывізацыі народных мас у першыя гады Савецкай улады, сучасныя творы ў гучанні духавых аркестраў з"явіліся магутным арганізацыйна-мабілізуючым каталізата-

---

50 Гр. Серый. Ставка в период 27--29 августа 1917 года // Фронт, 3 сентября 1917 г.

рам сацыяльна-палітычных настрояў у радах прыхільнікаў народных франтоў рэспублік Прыбалтыкі ў пачатку 1980-х гадоў.

Для ілюстрацыі закранутай праблемы звернемся да некаторых прыкладаў сусветнай выканальніцкай практыкі ўключэння героіка-патрыятычнага рэпертуару ў праграмы духавых аркестраў. На традыцыйны Міжнародны фестываль-конкурс аматарскіх духавых аркестраў вялікага саставу /70--80 удзельнікаў/ раз у чатыры гады ў горад Астрава прыязджалі калектывы з Галандыі, Германіі, Венгрыі, Польшчы, Чэхаславакіі, Югаславіі, Японіі, СССР і іншых краін. Мэта гэтага фестывалю-конкурсу -- садзейнічаць барацьбе за мір і дружбу паміж народамі. Гэтую мэту адлюстроўваюць у рэпертуары аркестраў абавязковыя творы. У 1981 годзе, напрыклад, усе ўдзельнікі фестывалю-конкурсу выконвалі уверцюру чэшскага кампазітара М.Юхалкі "No pasaran!", прысвечаную памяці гераічнай барацьбе іспанскага народа з фашызмам у 1937 годзе[51]. Звернемся да праграм аднаго з ваенных аркестраў Германіі. У яго канцэртным рэпертуары побач з класікай, сучаснымі творамі, спалучаюцца такія творы, як уверцюра "Эгмонт" і "Марш Йоркскага корпуса" Бетховена, разгорнутая канцэртная п"еса "Народжаныя ў барацьбе", заснаваная на папулярных мелодыях міжнародных песень барацьбы і салідарнасці ў апрацоўцы Баумана, марш "Заўсёды на баявым пасту" Бетмана і інш.[52]. Дастаткова прыгадаць і творы, якія адлюстроўвалі барацьбу ліванскага народа і былі выкананы на адным з міжнародных фестываляў сучаснай музыкі ў Маскве. З яркімі творамі героіка-патрыятычнага накірунку аматары духавой музыкі Беларусі пазнаёміліся ў час канцэртных выступленняў у Белдзяржфілармоніі і Мінскім Акругоіым Доме афіцэраў Прэзідэнцкага аркестра марской пяхоты ЗША пад кіраўніцтвам палкоўніка Джона Р.Буржуаза ў 1990 годзе. Нават прыведзеныя лаканічныя прыклады даюць уяўленне аб тым, што героіка-патрыятычная тэматыка ў рэпертуары духавых аркестраў актуальная, яна пастаянна прысутнічае ў канцэртных праграмах калектываў. У сваім даследаванні мы пастараліся ўзнавіць і паказаць тую шырыню і маштабнасць,

---

51 Макаров Г. Пусть медные трубы звучат! // Сов. музыка.-- 1982, № 1. -- С. [illegible].

52 Гунев Г. Оркестр высокого класса // Музыкальная жизнь. -- 1982, № 1. -- С. 19.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якая характэрна для гераіка-патрыятычнай тэматыкі у рэпертуары духавых аркестраў Беларусі /пры неабходнасці мы выкарыстоўвалі яркія аналагі, стараліся максімальна спыніцца на аналізе рэпертуару, хоць зусім было відавочна, што многія творы разглядаемай тэматыкі даволі часта паўтараюцца, і тут, на наш погляд, патрэбна дакладная каардынацыя такіх твораў на ўзроўні рэспублікі/. Безумоўна, прадстаўлены матэрыял не прэтэндуе на паўнату раскрыцця абазначанай праблемы, а толькі дае арыентацыю тым спецыялістам, якія захочуць прадоўжыць даследаванні у гэтым накірунку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ